4. Смолькова И.В., Исаев Ю.С., Ободенко Н.П. Уголовно-правовые меры противодействия преступности / Смолькова И.В., Ю.С. Исаев, Н.П. Ободенко // Криминологический журнал Байкальского государственного университета экономики и права. – 2013. – № 4. – С. 86 – 93.
5. Степанко С.Г. Донорство органов (тканей) человека: правовые вопросы с.124-144.
6. Зотов П.Б., Родяшин Е.В. Суицидологичекий паспорт территории как этап развития суицидальной превенции / П.Б. Зотов, Е.В. Родяшин // Суицидология. – 2013. – № 4 (13). – С. 55 – 60.
7. Исмагилов Р. А. Совершенствование уголовной ответственности за надругательство над телами умерших / Р.А. Исмагилов // Пробелы в российском законодательстве. 2014. – № 2. – С. 140 – 144

***Голубева Людміла Леанідаўна***

## СТАТУТ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1588 ГОДА – АСНОЎНАЯ КРЫНІЦА КАНСТЫТУЦЫЙНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ XVI – XVIII СТАГОДДЗЯЎ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт

***Анатацыя.*** Паказана, што Статут 1588 г. з’яўляўся асноўнай крыніцай канстытуцыйнага права Беларусі XVI – XVIII стагоддзяў. Звернута ўвага на дзяржаўна-прававое значэнне Статута 1588 г., які насуперак акту Люблінскай уніі 1569 г. заканадаўча аформіў захаванне Вялікага Княства Літоўскага як самастойнай дзяржавы. Адзначаны ўплыў прагрэсіўных прававых ідэй Л. Сапегі на змест Статута 1588 г.

***Ключавыя словы***: Статут 1588 г.; дзяржаўна-прававое значэнне; тэорыя падзелу ўлад; свабода веравызнання; ідэя ўмацавання прававога парадку; крыніца канстытуцыйнага права Беларусі; прагрэсіўныя прававыя ідэі.

Вывучэнне прававой спадчыны беларускага народа з’яўляецца важнай задачай гісторыка-прававой навукі. Помнікі права адлюстроўваюць у сабе палітыка-эканамічнае становішча той ці іншай дзяржавы, структуру грамадства, правы і абавязкі ўсіх слаёў насельніцтва і шмат іншае. Яны з’уляюцца найбольш дакладнымі і надзейнымі крыніцамі ведаў аб узроўні прававой культуры. У іх знаходзяць адлюстраванне філасофскія, палітыка-прававыя погляды грамадства, яго культура і побыт.

Перавыданне ў 1989 г. Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. (далей – Статут 1588 г.) (не перавыдаваўся з XIX ст.) з перакладам,

шматлікімі артыкуламі па гісторыі дзяржавы і права і каментарыямі да прававых номаў, з'явілася штуршком для правядзення даследаванняў прававой гісторыі Беларусі. У навуковых публікацыях А. Ф. Вішнеўскага, Т. І. Доўнар, В. А. Круталевіча, С. Ф. Сокала, І. А. Юхо і іншых беларускіх навукоўцаў-прававедаў, гісторыкаў, філосафаў у кантэксце разгляду агульных гістарычных пытанняў закранаецца шэраг пытанняў прававой гісторыі [1]. Аднак, нягледзячы на пэўныя дасягненні апошніх гадоў па вывучэнню прававой гісторыі Беларусі, у ёй застаюцца значныя прабелы, захоўваецца дыскусійнасць у яе разглядзе.

Статут 1588 г. з кропкі гледжання прававой тэорыі і практыкі меў значна пераваг перад сваімі папярэднікамі – статутамі Вялікага Княства Літоўскага 1529 і 1566 гг. (далей – Статут 1529 г., Статут 1566 г.) [2; 3]. У ім больш дакладна былі адлюстраваны дзяржаўна-прававыя ідэі таго часу, асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, а таксама некаторыя прагрэсіўныя ідэі, выказаныя ідэолагамі гуманізму. Асноўнае ж дзяржаўна-прававое значэнне Статута 1588 г. заключалася ў тым, што ен заканадаўча аформіў захаванне Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) як самастойнай дзяржавы насуперак акту Люблінскай уніі 1569 г. Складальнікі Статута 1588 г. не ўнеслі ніводнай нормы, якая б супярэчыла дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ. Нормы канстытуцыйнага права, выкладзеныя ў Статуце 1566 г., былі захаваны і ў Статуце 1588 г. Складальнікі Статута 1588 г. як бы не заўважылі або не зразумелі акта Люблінскай уніі аб уключэнні ВКЛ у склад Польшчы. Такія адносіны канстытуцыйна-прававых нормаў Статута 1588 г. да акту Люблінскага сейма 1569 г. з'яўляюцца дакладным пацвярджэннем таго, што шляхта ВКЛ, удзельнічаючы ў працы соймаў, варожа адносілася да аб'яднанная ВКЛ з Польшчай.

Статут 1588 г. складаўся з 14 раздзелаў, у якіх утрымлівалася 487 артыкулаў. У Статут увайшлі нормы канстытуцыйнага права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх дзяржаў. Ен абагульніў тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з іх апярэджвалі свой час. У Статуце 1588 г. знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлад на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі). Ідэі Рэфармацыі і верацярпімасці былі замацаваны ў артыкуле 3 раздзела 3, згодна з якім вялікаму князю і ўсім дзяржаўным органам было прадпісана забяспечыць спакой усіх жыхароў дзяржавы, незалежна ад таго, якога вучэння яны прытрымліваліся ў хрысціянскім веравызнанні [4]. Кожны вольны чалавек мог пры жаданні выехаць за мяжу, калі гэта

рабілася не на шкоду сваей краіне. Статут 1588 г. юрыдычна замацаваў тыя фактычныя адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Польшчай пасля 1569 г., але абавязваў урад вярнуць адлучаныя ад Княства землі, забараняў прызначаць на дзяржаўныя пасады і надзяляць зямлей "чужаземцаў і загранічнікаў", у тым ліку і падданых Польшчы, захаваў адасобленасць дзяржаўных устаноў, арміі, заканадаўства, эканомікі і фінансаў ВКЛ. Уладаром дзяржавы прызначаўся вялікі князь, названы ў Статуце 1588 г. гаспадаром. Вялікі князь валодаў шырокімі паўнамоцтвамі ва ўнутраных і знешніх справах дзяржавы. Ен лічыўся кіраўніком усіх вышэйшых распарадча-выканаўчых органаў, прызначаў і змяшчаў з пасад службовых асоб, распараджаўся войскам, дзяржаўнай маемасцю і скарбам, мог накіроўваць і прымаць замежных паслоў, заключаць пагадненні з іншымі дзяржавамі, уступаць у саюзы, абвяшчаць вайну і заключаць мір. Вялікі князь валодаў правам заканадаўчай ініцыятывы, ажыццяўляў вышэйшы суд у дзяржаве і іншыя важнейшыя функцыі дзяржаўнай улады і кіравання. Шэраг артыкулаў Статута 1588 г. абавязвалі вялікага князя і дзяржаўныя органы кіравання паступаць у адпаведнасці з законам, клапаціцца аб інтарэсах дзяржавы і народа. Але многія паўнамоцтвы вялікага князя былі абмежаваны і выконваць іх ен мог толькі са згоды Рады ВКЛ, сойма, вышэйшых дзяржаўных службовых асоб. Статут 1588 г. замацоўваў феадальны грамадскі лад, наяўнасць двух асноўных класаў: феадалаў і феадальна-залежных сялян. Згодна з артыкулам 30 раздзела 3 гаспадар і ўсе дзяржаўныя органы павінны былі забяспечыць спакой усіх жыхароў дзяржавы, незалежна ад таго, якога вучэння яны прытрымліваліся ў хрысціянскім веравызнанні. Свабода веравызнання, што існавала ў той час у Беларусі, садзейнічала развіццю прагрэсіўных прававых ідэй, якія выказваліся знакамітымі асветнікамі таго часу С. Будным, А. Воланам і інш. Князі, паны радныя і паны харугоўныя мелі права судзіць не толькі простых людзей, але і залежную ад іх шляхту, даваць ей у часовае карыстанне землі, маенткі, а таксама адбіраць гэтыя маенткі, нягледзячы на даўнасць уладання. Статут 1588 г. рэгламентаваў некаторыя правы і абавязкі простых людзей і прадстаўнікоў этнічных груп – сялян, слуг, чэлядзі, мяшчан, рамеснікаў, яўрэяў, татараў. Ен абараняў інтарэсы буйных і сярэдніх феадалаў і ўзмацняў іх прывілеяванае становішча, канчаткова запрыгоніў сялян. Статут 1588 г. дэклараваў, што ўсе простыя людзі разам з феадаламі ўдзельнічаюць у выбранні гаспадара. Аднак простых людзей не дапускалі ў сойм, а іх удзел у палітычным жыцці абмяжоўваўся выключна мясцовымі валаснымі справамі.

Праз увесь Статут 1588 г. праводзіцца ідэя ўмацавання прававога парадку, пры якім усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы абавязаны былі дзейнічаць толькі ў адпаведнасці з законам. Ідэя прававога парадку была накіравана супраць дэспатызму гасудара, буйных феадалаў і сярэдневяковай тэакратычнай тэорыі паходжання і сутнасці дзяржавы. Гэта ідэя была выкладзена Л. Сапегам у Звароце да ўсіх саслоўяў ВКЛ. Ен пісаў "… для таго правы ўстаноўлены, каб багатаму і моцнаму не ўсе можна было рабіць. Як Цыцэрон казаў, што з'яўляемся нявольнікамі правоў для таго, каб карыстацца свабодай маглі". Абвяшчэнне ідэі верхавенства права ў перыяд феадалізму сведчыла аб зараджэнні новай дзяржаўна-прававой тэорыі, якая найбольш поўна выявілася ў нормах канстытуцыйнага права, дзе былі адлюстраваны дзяржаўны суверэнітэт, грамадскі і дзяржаўны лад, асноўныя правы і абавязкі насельніцтва, галоўныя прынцыпы судовага ладу.

Выданне Статута 1588 г. мела выключна важнае значэнне для ўсей наступнай гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці. Статут 1588 г. з'явіўся асноўнай крыніцай канстытуцыйнага права Беларусі ў XVI – XVIII ст.ст. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі Статут 1588 г. працягваў дзейнічаць у Віцебскай і Магілеўскай губернях да 1831 г., а ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай – да 1840 г. Ен быў дзеючым законам больш за 250 гадоў. Складальнікі і рэдактары Статута 1588 г. унеслі ў яго цэлы шэраг прагрэсіўных нормаў, якія паставілі яго на адно з першых месцаў сярод помнікаў феадальнага права еўрапейскіх краін.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Вишневский, А.Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917 – 1995 гг.) / А.Ф. Вишневский. – Минск: ТПА "Форум", 1995. – 272 с.; Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А.Ф. Вішнеўскі. – Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. – 319 с.; Довнар, Т.И. Краткий очерк истории государства и права Республики Беларусь / Т.И. Довнар. – Минск: ИСЗ. 1997. – 128 с.; Доўнар, Т.І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV – XVI стагоддзях / Т.І. Доўнар. – Мінск: Пропилеи, 2000. – 224 с.; Доўнар, Т.І. Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.) / Т.І. Доўнар. – Мінск: БДУ, 2000 – 80 с.; Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: Амалфея, 2007. – 400 с.; Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2014. – 552 с.; Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т.І. Доўнар. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2021. – 432 с.; Круталевич, В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.) / В.А. Круталевич. – Минск: Национальная академия Наук Беларуси, Ин-т фил. и права, Журнал «Право и экономика», 1999. – 385 с.; Юхо, Я.А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я.А. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае,

1991. – 236 с.; Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 270 с.; Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я.А. Юхо. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000 – 2003.;
2. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года. – Минск: Издательство Академии наук БССР, 1960. – 254 с.
3. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал. Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

***Девятовская Каралина Викторовна***

# ЭВОЛЮЦИЯ ПОНЯТИЯ АДМИНИСТРАТИВНОГО ПРАВОНАРУШЕНИЯ

УО «Полоцкий государственный университет», ассистент кафедры уголовного права и криминалистики, магистр юридических наук, k.devyatovskaya@pdu.by

***Аннотация.*** В статье представлен анализ понятия правонарушения через призму исторического анализа. Проанализированы основные этапы развития понимания противоправного деяния, на основании чего сделаны выводы о преемственности признаков правонарушения на современном этапе.

***Ключевые слова:*** правонарушение; эволюция понятия; административное правонарушение.

Проблематика поведения человека, его социально неодобряемого поведения вызывала и вызывает интерес у ученых разной предметной направленности. В системе нашего правосознания мы отожествляем такое поведение с понятием правонарушения в широком смысле, не вдаваясь в законодательное и доктринальное определения.

Важно отметить, что современная научная разработанность понятия правонарушения в основном нашла свое отражение в отраслевых науках юриспруденции, динамичное изменение законодательства, а также отсутствие полноценной унифицированной терминологии говорит о необходимости проведения комплексного исследования понятия административного правонарушения, на основании изучения наиболее значимых работ, посвященных теории правонарушения в его историческом динамизме, анализе форм противоправных деяний на уровне действующего законодательства, практики его реализации.